Трубчык , А. Г. Адукацыйная палітыка польскіх улад падчас ваеннй эвакуацыі з беларускай тэрыторыі (ліпень – верасень 1920 г.) / А. Г. Трубчык // Актуальные проблемы и перспективы изучения новой и новейшей истории зарубежных стран: материалы междунар. науч.-теорет. конф., посвящ. 75-летию образования каф. истории Нового и Новейшего времени / редкол. : В. С. Кошелев (пред.) [и др.], — Минск: Изд. центр БГУ, 2012. — С. 187-190

*А. Г. Трубчык*
*Беларускі дзяржаўны аграрна-тэхнічны ўніверсітэт, выкладчык*

# АДУКАЦЫЙНАЯ ПАЛІТЫКА ПОЛЬСКІХ УЛАД ПАДЧАС ВАЕННАЙ ЭВАКУАЦЫІ З БЕЛАРУСКАЙ ТЭРЫТОРЫІ (ЛІПЕНЬ – ВЕРАСЕНЬ 1920 г.)

З пачаткам наступлення польскіх войскаў 8 лютага 1919 г. на занятай тэрыторыі Беларусі пачала ўсталёўвацца ваенная, а затым грамадзянская ўлада. З 13 мая 1919 г. Пілсудскі выдаў дэкрэт, які тычыўся арганізацыі Грамадзянскага ўпраўлення Усходніх зямель (ГУУЗ), занятых польскімі войскамі. Генеральны камісарыят станавіўся цэнтральнай уладай і непасрэдна падпарадкоўваўся Галоўнакамандуючаму. Першапачаткова камісарыят складаўся з 13 аддзелаў (сярод іх аддзел асветы і культуры, які з красавіка па кастрычнік 1919 г. узначальваў Уладзіслаў Ліхтаровіч).

Паступова арганізацыя Генеральнага камісарыята ўскладнялася, былыя аддзелы былі рэарганізаваны ў 8 секцый. З кастрычніка 1919 г. секцыю асветы і грамадскай апекі (САіГА) узначаліў Люцыян Зажэцкі. Пры секцыі працавалі школьныя рэвізоры, галоўнай задачай якіх з’яўлялася “ажыццяўленне непасрэднага кантролю за педагагічнай і грамадскай дзейнасцю школ усіх тыпаў”[1, с. 25].

Наступнымі ступенямі ў арганізацыйнай структуры афіцыйнай адукацыйнай улады з’яўляліся акруговыя і павятовыя школьныя інспектары, якія афіцыйна пачалі выконваць свае абавязкі ў адпаведнасці з распараджэннем намесніка Генеральнага камісара Эдмунда Івашкевіча ад 5 лістапада 1919 г. аб арганізацыі паветаў і павятовых улад.

На тэрыторыі ГУУЗ афіцыйна дазвалялася арганізацыя розных нацыянальных школ згодна з жаданнем мясцовага насельніцтва, пры гэтым значную фінансавую падтрымку з боку дзяржавы атрымалі пераважна польскія школы. Матэрыяльная дапамога польскім школам, якую таксама аказвалі грамадскія арганізацыі, значна паўплывала на зніжэнне папулярнасці школ з іншымі мовамі навучання. Найбольш моцны ўздым польскага школьніцтва адбыўся з кастрычніка-студзеня 1919 г. на тэрыторыі Брэстчыны, Віленшчыны і Гродзеншчыны.

Вясной 1920 г. ваенна-палітычная сітуацыя на польска-савецкім фронце змянілася. Вайна ўступіла ў новую палітычную фазу. У пачатку сакавіка 1920 г. войскі Польшчы пачалі ваенныя дзеянні на Палессі на стыку Заходняга і Паўднёва-Заходняга франтоў. 14 мая пачалося контрнаступленне Чырвонай Арміі ў Беларусі. Да канца мая палякі пакінулі Лепель, Полацк, Глыбокае. 11 ліпеня савецкія войскі занялі Мінск, 14 ліпеня – Вільню, 19 ліпеня – Гродна, а 1 жніўня авалодалі Брэстам. Тэрыторыя Беларусі апынулася пад савецкай уладай.

16 ліпеня па распараджэнню Генеральнага камісара было створана эвакуацыйнае бюро і аддзел на чале з В. Супіньскім. 23 ліпеня была арганізавана

ліквідацыйная камісія, якой перадаваліся паўнамоцтвы, звязаныя з эвакуацыяй служачых і маёмасці ГУУЗ на тэрыторыю Польшчы. З 19 ліпеня 1920 г. САіГА разам з іншымі адміністрацыйнымі структурамі Генеральнага камісарыята была эвакуіравана ў Торунь, дзе пачала займацца рэгістрацыяй і арганізацыяй дапамогі настаўнікам, прыманнем справаздач ад школьных інспектаратаў. Настаўніцтва (у асноўным польскае) эвакуіравалася пры вельмі складаных умовах – у большасці паветах у гэты час распачаліся летнія настаўніцкія курсы і слухачам прыйшлося выязджаць без рэчаў і часта без сродкаў. Пры эвакуацыі ўсе школьныя інспектараты панеслі значныя страты: не ўдалося забраць большасць падручнікаў і школьных дапаможнікаў, пакінута была мэбля, друкарскія машынкі і інш. [2, к. 48].

Былому школьнаму інспектару Віленскай акругі было даручана арганізаваць часовую касу і збіраць усе грашовыя сродкі, якія прывозілі школьныя інспектары. З гэтых грошай пачала выдавацца першая дапамога настаўнікам. Пры двух інтэрнатах пры настаўніцкіх семінарыях пад Торунем былі арганізаваны прытулкі на 340 чалавек. Секцыя асветы зарэгістравала 539 настаўнікаў агульнаадукацыйных школ, аднак канчатковую лічбу да пачатку новага навучальнага года вызначыць было немагчыма: многія настаўнікі размясціліся на прыватных кватэрах і не ведалі аб неабходнасці рэгістрацыі ці выкарыстоўвалі час для пошуку працы ў іншай сферы.

Настаўнікі сярэдніх школ рэгістраваліся асобна, ім забаранялася пакідаць педагагічную дзейнасць і ўступаць у войска. Напярэдадні эвакуацыі секцыя асветы распрацавала сетку польскіх гімназій на тэрыторыі ГУУЗ, і, як бачна, ад сваіх планаў адыходзіць не збіралася, паколькі лічыла сітуацыю часовай. Таму настаўнікі сярэдніх школ былі размеркаваны па будучых гімназіях і ўзяты пад пільны кантроль з боку асветных улад [2, к. 49].

Значныя цяжкасці былі з выплатай зарплаты. Настаўнікі, згуртаваныя ў прытулках, атрымалі зарплату за жнівень і эвакуацыйную дапамогу. Іншыя, якія рассяліліся у асноўным па прыватных кватэрах, атрымлівалі зарплату па агульных табелях па меры іх звяртання ў САіГА. У найбольш горшым становішчы апынулася мінскае настаўніцтва. У маі 1920 г. школьны інспектар Мінскай акругі Л. Квек дабіўся ад Генеральнага камісара згоды на паднясце зарплаты настаўнікам польскіх школ Міншчыны. На Мінскую акругу былі вылучаны дадатковыя крэдыты, а зарплата настаўнікам польскіх школ прыраўноўвалася да норм, акрэсленых у распараджэнні ад 16 сакавіка 1920 г. Аднак напярэдадні эвакуацыі ў Л. Квека не былі падрыхтаваны ні ведамасці на зарплату, ні новы праект бюджэту. Каб падтрымаць мінскае настаўніцтва першапачаткова былі выкарыстаны сродкі, якія былі запланаваны на летнія курсы, а потым было вылучана 200000 марак [2, к. 56].

У сувязі з ліквідацыяй ГУУЗ пачалася змена былога кіраўніцтва. З 1 верасня ўступілі ў войска вядучыя кіраўнікі аддзелаў і рэферэнты былой секцыі асветы. У сярэдзіне верасня ў складзе былога кіраўніцтва заставалася 9 школьных інспектараў з Віленскай акругі, 6 з Брэсцкай і 4 з Менскай. Падчас эвакуацыі зніклі разам з усёй дакументацыяй і грашовымі сродкамі інспектары Ашмянскага, Вілейскага, Баранавіцкага, Мазырскага, Бабруйскага і Ігуменскага паветаў. [2, к. 58].

У сувязі з паспешнай эвакуацыяй і ліквідацыяй ГУУЗ змяніліся асноўныя накірункі адукацыйнай палітыкі польскіх улад. Праз новую адміністрацыю на беларускіх землях пачала праводзіцца афіцыйная палітыка Польскай дзяржавы, якая ў гэты час ужо не мела неабходнасці абапірацца на федэрацыйныя ідэі. Сістэма кіравання ў галіне адукацыі на беларускіх землях была арганізавана згодна з новымі

адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленнем і прававой базай. Справамі адукацыі і асветы ў гэты перыяд займаўся дэпартамент асветы, які падпарадкоўваўся Міністэрству веравызнанняў і грамадскай асветы Польшчы. Пасля падпісання прэлімінарных умоў міру паміж Польшчай і РСФСР 12 кастрычніка 1920 г. развіццё адукацыі на заходніх беларускіх тэрыторыях, якія апынуліся ў складзе Польшчы (Палескае і Наваградскае ваяводствы), канчаткова перадавалася ў сферу кампетэнцыі польскіх дзяржаўных органаў улады.


1. Gierowska-Kałłaur, J. Zarząd Cywilny Ziem Wschodnich (19 lutego-9 września 1920). Warszawa : Wydawnictwo Neriton Institut Historii PAN, 2003.
2. Raport likwidacyjny Sekcji Oświecenia Publicznego, 1920 r.// BPW. DSDiR. ZCZW. – Akc.1680.